Часнойть Е.М., студ. гр. 519 ФММ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Ражкова Л.Л.,
канд. пед. навук, дацэнт

# РАЗВІЦЦЁ ІНТАРЭСУ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ДА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

На сённяшні дзень надзвычайна востра стаіць задача адраджэння нацыянальнай культуры. У сувязі з гэтым, асаблівую значнасць набывае далучэнне падрастаючага пакалення да беларускай народнай культуры, у якой адлюстраваны не толькі галоўныя гістарычныя падзеі і характар нацыі, але і ў яскравай форме – своеасаблівыя рысы нацыянальнага музычнага мыслення.

Нацыянальная  музычная культура – нязменная крыніца духоўнасці і маралі, замацаваная многавяковым вопытам. Менавіта музычная дзейнасць з'яўляецца тым відам мастацкай дзейнасці, які прадстаўляе шырокія магчымасці для выкарыстання фальклорнай спадчыны ў працэсе выхавання асобы і далучэння яе да агульначалавечых каштоўнасцей: прыгажосці, дабрыні і справядлівасці.

Фальклор з'яўляецца адной з найважнейшых форм, праз якія народ выказвае глыбокае пачуццё любві і прыхільнасці да роднай зямлі, павагі да чалавека, працы.  Дзякуючы яму, дзіця пазнае простыя, але вельмі важныя рэчы пра з'явы прыроды, узаемаадносіны паміж людзьмі.

Лічыцца, што галоўным фактарам, дзеля вывучэння і засваення фальклору, з'яўляецца зацікаўленасць саміх навучэнцаў.

Інтарэс – гэта спецыфічная накіраванасць асобы на што-небудзь. Вывучэнне інтарэсу як псіхалагічнага феномену пачалося ў XIX ст. У сучаснай псіхалагічнай літаратуры ўзгадваецца, што інтарэс выяўляецца ў імкненні бліжэй азнаёміцца з прадметам, у схільнасці канцэнтраваць увагу на прадмеце. Інтарэс накіроўвае чалавека да пэўнай дзейнасці, таму інтарэс па сутнасці звязаны з тэндэнцыяй  пабуджэння да той ці іншай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каб развіваць творчасць дзяцей у працэсе фальклорнага навучання і абуджаць іх інтарэс, кіраўнік сам павінен выкладаць творча. Ад кіраўніка патрабуецца мэтанакіравана падбіраць і вар'іраваць фальклорны матэрыял, метады працы, улічваючы ўзроставыя і псіхафізіялагічныя, індывідуальныя асаблівасці кожнага дзіцяці. Інтарэсам дзяцей малодшага школьнага ўзросту, перш за ўсё адпаведны: рух, іграваая дзейнасць,творчасць.

Працуючы ў фальклорным гуртку «Вясёлыя музыкі» з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту я выкарыстоўваю галоўным чынам наглядныя, практычныя і творчыя метады (гутарка, апавяданне, дэманстрацыя, ілюстрацыя, пазнавальныя гульні і г.д.)

Пры знаёмстве дзяцей з народнымі музычнымі інструментамі я не толькі расказваю ім аб інструментах, але і прапаноўваю дзецям зрабіць гэтыя інструменты сваімі рукамі. Так як малодшыя школьнікі вельмі любяць што-небудзь майстраваць, то яны з вялікай цікаўнасцю аднесліся да гэтага задання.

Напрыклад, у скрынкі ад духоў і адэкалону дзеці насыпалі крупы і ўпрыгожвалі іх самаклейнай паперай. Пустыя флаконы ад шампуню, бляшанкі ад парашку, бутэлькі ад ёгурту пераўтварылі ў «шумелкі» і «грымелкі» (у залежнасці ад напаўняльніка). Для «шумелак» дзеці выкарыстоўвалі крупы (рыс, грэчку, пшаніцу), гук атрымліваўся мяккім і шуршачым. Калі дзеці выкарыстоўвалі фасолю, то гук быў гучным і звонкім – гэта «грымелкі».

Такія інструменты я з дзецьмі выкарыстоўваю дзеля творчага музыцыравання і дзеля абыгрывання розных вобразаў (напрыклад, бягуць мышкі, скачуць зайцы, і г.д.)

Яскравыя і звонкія бубны атрымаліся з круглых пластыкавых скрынак, якія дзеці ўпрыгожылі самаклейнай паперай і шоўкавымі стужкамі. Звонкі і бадзёры барабан атрымаўся з пустога пластыкавага вядзерца з-пад маянэзу. А барабанныя палачкі – гэта старыя фламастары. З каробак ад сотавых тэлефонаў мы з дзецьмі робім неагучаныя музычныя інструменты –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гармонік, баяны і дудачкі. Потым дзеці размалёўваюць гэтыя інструменты алоўкамі ці фламастарамі.

Уяўляючы сябе сапраднымі музыкамі, дзеці іграюць на гармоніку, баяне, дудачцы.

Таксама на занятках, прысвечаных знаёмству з музычнымі інструментамі, пасля апавядання аб канкрэтным інструменце, дзеці размалёўваюць невялікі малюнак з гэтым інструментам. Гэты від дзейнасці вельмі падабаецца дзецям, бо яны не толькі ўспрымаюць на слых інфармацыю, але яшчэ і разглядаюць музычны інструмент у час малявання.

Таксама ў гуртку мы займаемся спевамі – спяваем рускія і беларускія народныя песні, праводзім фальклорныя святы.

Песенны рэпертуар складаюць простыя і зразумелыя па змесце творы, з характэрнымі паўторамі, зваротамі. ( Напрыклад, Б.н.п. « Ты, зязюля, не кукуй», « Я табун сцерагу », « Воўк і авечачкі», « Як на рэчачцы » і г.д.). Самымі цікавымі і любімымі для дзяцей з'яўляюцца песні, у якіх актыўнымі дзейнымі асобамі паўстаюць кот, сабака, верабейка, мядзведзь, якім надаюцца чалавечыя здольнасці. Пры спевах гэтых песень, я прапаноўваю дзецям абыгрываць кожнага з персанажаў, так як гэта вельмі цікава дзецям (яны смяюцца, весяляцца) і адначасова з гэтым вучацца адрозніваць дабро і зло, праўду і крыўду.

Але, як паказала практыка маёй працы ў гуртку, больш за ўсё цікавасць у дзяцей выклікае каляндарная абраднасць – гэта жаданне паўтараць «магічныя» словы, выконваць абрадавыя дзеянні, забаўляцца ў гульнях, і, наогул, прымаць самы актыўны ўдзел у народным свяце.

Так намі былі падрыхтаваны «Каляды». У час рэпетыцый, вельмі цікава дзецям была праца над прамаўленнем фразы свайго персанажа, дзейнічаць са сваімі сябрамі-партнёрамі, выконваць дыялогі паміж героямі твораў. Да падрыхтоўкі свята я далучыла бацькоў, якія дапамагалі развучваць з дзецьмі тэксты, прысутнічалі на рэпетыцыях і падтрымлівалі сваіх дзяцей, што вельмі неабходна для дзяцей гэтага ўзросту. Каб яшчэ больш зацікавіць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяцей, я неаднаразова праводзіла гутарку з дзецьмі пра Каляды, паказвала ілюстрацыі гэтага свята. У час правядзення Каляд мы з дзецьмі выконвалі жартоўныя песні ў форме пытанняў-адказаў, калядкі-забаўлянкі, якія смяшылі і выманьвалі падарункі ў гледачоў.

Вядома, найлепшай формай засваення ўзораў музычнага фальклору ў малодшых школьнікаў з'яўляецца гульня – нязменны сродак дзеля падтрымкі і развіцця інтарэсу. У працэсе гульні ў дзяцей развіваюцца гукавысотны слых, ладавае і музычна–рытмічнае пачуццё, музычная памяць, творчае мысленне.

У сваёй працы я таксама знаёмлю дзяцей з заклічкамі і прыгаворкамі, якія таксама падаю ў гульнёвай форме.

Асаблівы інтарэс выклікае ў дзяцей разгадванне загадак. Загадкі развіваюць фантазію дзяцей, з іх дапамогай яны ўключаюцца ў творчасць. Усё гэта я праводжу ў форме спаборніцтва. За кожны правільны адказ я надзяляю дзіця каляровай паперай. У каго больш каляровых паперак, той і пераможца.

Такім чынам, дзякуючы таму, што характэрнай асаблівасцю дзяцей малодшага ўзросту з'яўляецца іх эмацыянальная рэакцыя на ўсё вобразнае, яскравае, можна з упэўненасцю сказаць, што такія метады работы з дзецьмі на занятках фальклорам, як дэманстрацыя, ілюстрацыя, гутарка, пададзеныя ў гульнявой форме, маюць вялікі ўплыў на асобу і на развіццёё інтарэсу. Манатонныя, сумныя заняткі адчувальна памяншаюць як пазнавальны, так і мастацкі інтарэсы. Галоўным чынам у фарміраванні інтарэсу вялікае значэнне маюць змест, арганізацыя і эмацыянальная насычанасць заняткаў па фальклоры, якія з'яўляюцца наймацнейшымі крыніцамі стымуляцыі інтарэсаў дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Батрашэвіч Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. – Мн.: Навука і тэхніка, 1976, 166 с.

2. Белорусская этномузыкология: Очерки очерки истории / под ред. З. Можейко – Мн.: Тэхналогія, 1997, 254 с.
3. Грыневіч А. Навука сьпеву. – Вільня, 1925, 31 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ